

# «ПАРУСІЯ»

*Парусія – з грэцкай мовы – Другое прыйсце Гасподняе, якое павінна адбыцца пры сканчэнні веку, калі князь гэтага свету раптоўна набудзе вялікую моц і статус, так што ніхто не зможа без яго загаду ці кляйна: «ні купляць, ні прадаваць» [Адкр 13, 18]. Нават многія верныя будуць пераможаныя гэтым злом, упэўненыя ў Антыхрысце як у божым сыне.

• **Рубрыку вядзе святар Яўген Маліноўскі, кандыдат псіхалагічных навук, дацэнт**

”

## Ці годны чалавек славы?

Міхась

Слава Отцу и Сыну и Святому Духу. Аминь. Гэтае славаслоўе, па-грэцку doxologia, знаёмае з дзяцінства, хай сабе і атэістычнага, кожнаму. Ад моманту ўдзялення хросту да адпявання душы памерлага Троіца неадступна і паслядоўна крочыць разам з чалавекам шляхам Божым і адчыняе новыя таямніцы свайго ўвасаблення ў славе чалавека праз слова Божае. Так, яўрэйская Біблія культывуе значэнне славы Божай (kavod) як **вагу,** што на дзіва падобна да беларускага сэнсаўтварэння слова **«павага».** Вага чалавека ў жыцці вызначае яго значнасць, **паважнасць** (взвешенность) і пашану. У II стагоддзі да РХ прарок Дзініла тлумачыць таямнічы надпіс на сцяне, які ўзнік падчас пачварнага піру Бальтазара, цара Халдзеі: «ты ўзважаны на вагах і знойдзены вельмі лёгкім»[Дан 5, 27]. У тую ж ноч дыктатар быў забіты, і царства прыняў Дарый, праз якога Бог вызваліў яўрэяў з Вавілонскага палону. Такім чынам, павага з габ-

слаўнае імя, у параўнанні з расійскім «вес человека в обществе», колькі сапраўдную годнасць і вартасць, якія вымяраюцца вагою душы. Нашаму ўжытку не пасуе выраз «вага чалавека ў грамадстве», затое характэрна супрацьлеглае расійскай лінгвістычнай традыцыі ўспрыманне выразу «зрабіць ад душы» як зрабіць бязвыплатна. А ў расійскай мове «сделать от души» это «сделать качественно».

У сувязі сэнсаўтварэння нагадваецца даўні, за савецкім часам, выпадак у Паланзе (Літва), дзе я, жадаючы зрабіць прыемнае жонцы, паабяцаў швейцару быць «благодарным» за допуск у рэстаран без папераджальнага заказу. Пасля шчырых слоў удзячнасці мы «ничтоже сумняшеся» накіраваліся да залы, але былі бесцырымонна затрыманы: «как Вам не стыдно, вот Ваша жена свидетель, что Вы обещали отблагодарить!». Урэшце здагадаўшыся, чаго чакае ад мяне метрдатэль, я выняў з гаманца чырвоную «благо-

самого человечного человека». Гэты прыклад адлюстроўвае ментальныя асаблівасці ўспрымання слоў. У той жа Літве slovo разумеецца менавіта як слава. У старажытнай Палестыне Абрагам называўся слаўным, таму што быў «вельмі багаты на быдла, срэбра ды золата»[Быц 13, 2]. Шматпакутлівы Іёв, спустошоны і **зняважаны,** усклікае «Ён зняў з мяне маю славу»[Іёв 19, 9], гэта значыць **вагу** багацця, **павагу**.

Заклік «слава Украіне» разумеецца як яе вольнасць і ззянне. У той жа час свабода нашай краіны больш яскравая ў закліку «жыве Беларусь», у параўнанне з прыцягнутым і штучным «слава табе, беларускі народ». Насамрэч, славу павінна аддаваць Богу, а чалавеку і краіне – годную **павагу** і **ўвагу**. У той жа час Бог не касуе найвышэйшай годнасці чалавека, якога ўвенчвае «славай і гонарам»[Пс 8, 6]. Але каштоўнасць чалавечай славы звязваецца з маральнымі і асабістымі ўчынкамі, сярод якіх на першым месцы падпарадкаванне Богу як адзінай трывалай аснове славы і шчасця. Кніга Псальмаў, альбо пахвалы пачынаецца словамі: «Шчаслівы муж, што не ходзіць на раду паганых, і не стаіць на сцежцы грэшных, і не сядзіць на сходзе распуснікаў, але ў законе Госпада воля яго, і аб законе Яго мяркуе ён дзень і ноч. І будзе ён як дрэва, пасаджанае пры струменях вод, якое прыносіць плод у свой час, і лісце яго не жухне, і ва

Вось такая слава дасягальная для чалавека, які паслядоўна Хрысту не прымае славы ад людзей. Ён, як і кожны з нас, пакутаваў на вольнасць і не было ў Ім «выгляду і велічы, якая прывабіла б нас да Яго»[Іс 53, 2]. Яго смерць у вачах людзей з'явілася няўдачай ды паразай. Таму аж да гэтага часу служэнне Госпаду ацэньваецца людзьмі як справа ўбогая, бесперспектыўная для багацця і славы ад людзей. На гэтым смутным фоне вырысоўваецца Парусія як паўната славы Сына Чалавечага, які прыйдзе ў славе Айца свайго разам са святымі анёламі і завершыць сваю дзіўную справу збаўлення праз суд найвышэйшай вагі. У гэтай перспектыве нашыя хуткія пакуты і імгненная слава робяцца проста смешнымі. Тады кожны ганарысты зразумее, што свет быў створаны не для яго, але для Адзінароднага, у славе якога кожны веруючы здольны атрымаць і сваю частку, гэта значыць шчасце. Ад ззяння гэтай славы апостал Павел быў пазбаўлены зроку. Таму кожнаму з нас трэба хаця б раз быць узважаным ёю, каб ужо ніколі не быць прывабным уласным лёгкадумствам. Такому апусканню ў славу Божую ўдзяляецца чалавек праз хрост у імя Айца і Сына і Святога Духа. Праз Троіцу чалавек атрымлівае пазнанне, вольнасць і павагу як вагу багацця, пры якім самі нашыя пакуты ўдзельнічаюць у набліжэнні неад'емнай радасці. Ад такой свядо-

чуццё годнасці і гонару. А слова Божае адкрывае народ, якому «належыць усынаўленне і слава»[Рым 9, 4]. Запаведзі Божыя – слава Ізраіля, а ідалапаклонства – яго пачвара. Сусвет гіне ад празмернай славы людзей і недахопу славы Божай. Таму абавязак хрысціяніна ўхіляцца ад душэўнай эйфарыі натоўпу, славячага Антыхрыста. Яго «слава» мусіць адбыцца ў краіне, дзе склаліся ўмовы хрысціянскага культу, абмежаванага дэфіцытам хрысціянскай культуры і годнасці. Мяркуючы аб лесе Расіі, Уладзімір Салаўёў больш за сто год таму назад са страхам заўважае небяспечныя тэндэнцыі яе духоўнага стану. Прадчуваючы нешта страшнае ў яе будучыні, філосаф прыходзіць да высновы, што Расія – гэта другі Ізраіль, альбо Антыізраіль, і калі першы Ізраіль рыхтуецца да прыходу Хрыста, то другі рыхтуецца да прыняцця славы чалавека як славы Антыхрыста. Так было з Леніным, Сталіным, Хрушчовым, Брэжневым, гэты спіс мусіць быць падоўжаным імёнамі з плацдарма «проклятьем заклеймённых». У хуткім часе наступіць самы гідкі, душаспусташаючы перыяд царства Антыхрыста. Адзіная сіла, годная яму супрацьстаяць – гэта Адзіная Святая Паўсюдная Апостальская Царква Хрыстова. Таму зараз так **важна** кожнаму не толькі быць **паважным**, але і **адважным** у гэтай еднасці, каб мець ясны духоўны зрок і **заўважыць** славу божую ў

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ